# ВЫХАВАННЕ ПАДРАСТАЮЧАГА ПАКАЛЕННЯ НА ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

***А.П. Бунькевіч***
*ДУА «Валішчанская сярэдняя школа»*

Дзяржаўная палітыка ў галіне выхавання вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка: "Выхаваць грамадзяніна-патрыёта, адухоўленага ідэаламі дабра і сацыяльнай справядлівасці, здольнага тварыць і ствараць у імя Айчыны". Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў сістэмы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Асноўная задача выхавання асобы ў сучасных сацыякультурных умовах - фарміраванне ў падрастаючага пакалення пачуцця прыналежнасці і датычнасці да беларускай дзяржавы і грамадства, фарміравання грамадзянскай пазіцыі і патрыятызму.

Любое выхаванне пачынаецца з павагі да сваёй краіны, да яе нацыянальных традыцый, гісторыі і культуры. Нельга выхаваць сапраўднага патрыёта і годнага чалавека без паважлівага стаўлення да сваіх вытокаў. Рэспубліка Беларусь мае багатую духоўную спадчыну, якая фарміравалася на працягу стагоддзяў і перадавалася з пакалення ў пакаленне. Усё найбольш важнае, чым валодае чалавецтва: культура, мастацтва, тэхнічныя дасягненні, асновы ўсіх вышэйшых чалавечых каштоўнасцей - усё гэта закладваецца ў дзяцінстве і юнацтве, за школьнай партай, у працэсе штодзённага ўзаемадзеяння педагога, бацькоў і навучэнцаў [1].

На свеце шмат месцаў, звязаных з гістарычнымі падзеямі, жыццём выдатных людзей, прыроднымі аб’ектамі. Такія месцы ёсць і на тэрыторыі Валішчанскага сельвыканкама. У час імклівага тэхнічнага прагрэсу мы ўсё радзей успамінаем пра гераічнае мінулае сваёй

малой радзімы. Толькі той, хто добра ведае гісторыю свайго краю, ганарыцца сваімі землякамі, тонка адчувае прыгажосць прыроды, стане сапраўдным патрыётам Радзімы.

У школе на працягу многіх гадоў вядзецца прадуктыўная краязнаўчая работа, больш за 10 год працуе аб'яднанне па інтарэсах “Мой край і Я!”, вучэбнай праграмай па гісторыі Беларусі прадугледжваецца правядзенне ўрока «Наш край», які дазваляе ўлічыць асаблівасці гістарычнага развіцця канкрэтнага рэгіена і магчымасці выкарыстання мясцовага краязнаўчага матэрыялу, а таксама гісторыка-дакументальнай хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць».

Удзельнічаючы ў краязнаўчай рабоце, дзеці даведваюцца, што іх малая радзіма не заўсёды была такой, якой яны прывыклі бачыць яе зараз, што ў нашай вёскі і яе жыхароў багатае і слаўнае мінулае. Дзеці з цікаўнасцю займаюцца даследчай дзейнасцю, да якой прыцягваюць сваіх бацькоў, сваякоў, аднавяскоўцаў.

Мноства напрамкаў краязнаўчай работы, разнастайная тэматыка праектаў дазваляюць амаль кожнаму дзіцяці знайсці справу па душы.  Гераічнае мінулае нашай мясцовасці з’яўляецца адной з найбольш цікавых тэм. На тэрыторыі Валішчанскага сельвыканкама ёсць нямала помнікаў як Першай Сусветнай так і Другой сусветнай войнаў. Краязнаўства выхоўвае творчую ініцыятыву навучэнцаў, іх самастойнасць у выкананні розных заданняў. Вывучэнне краязнаўства дапамагае развіваць уменне самастойна знаходзіць патрэбную інфармацыю аб аб'екце, які яго зацікавіў.

Навучэнцам трэба растлумачыць, што менавіта яны адказныя за тыя матэрыялы, якія будуць вывучаць наступнае пакаленне. Таму, збіраючы інфармацыю, яны павінны падыходзіць да сучаснай гісторыі крытычна, выказваць розныя пункты гледжання, паказваць розныя бакі праблемы, гэта значыць быць даследчыкамі і несці адказнасць за навуковасць і правільнасць інфармацыі.

Гісторыя краю, мясцовыя падзеі вывучаюцца ў адзінстве трох часавых вымярэнняў: мінулае, сучаснасць і будучыня. Так вывучаючы са школьнікамі гісторыю вёскі, важна пазнаёміць іх не толькі з мінулым, але і сучасным станам вёскі, меркаваць пра перспектывы развіцця.

Гісторыя ўзнікнення нашай вёскі выклікае ў вучняў нязменную цікавасць. Падзеі робяцца больш яркімі і запамінальнымі, калі ў іх удзельнічаюць канкрэтныя людзі, асабліва, калі гэта сваякі ці знаёмыя. Плённая сумесная праца навучэнцаў, іх бацькоў, настаўнікаў, старажылаў  вёскі дала магчымасць сабраць багаты матэрыял. Таму мы вырашылі распрацаваць экскурсійны маршрут па нашай малой радзіме. Стварэнне турыстычнага маршруту экскурсійна-краязнаўчай накіраванасці – з'ява крэатыўная. Поспех такога маршрута будзе гарантаваны, калі экскурсавод добра ведае мясцовасць, яе гісторыю і адштурхоўваецца ад таго, што можа выклікаць цікавасць у людзей.

Сістэматызаваўшы сабраны матэрыял па гісторыі в.Валішча і яе наваколлі намі была створана інтэрактыўная карта “Тут радзімы маёй пачатак”. На занятках па інтарэсах “Мой край і Я!” навучэнцы сабралі галоўныя звесткі па распрацаваным маршруце; зрабілі фотаздымкі самых цікавых мясцін нашай малой радзімы, якія і сталі асноўнымі турыстычнымі аб’ектамі. Далей пачалася работа ў сетцы Інтэрнэт. Карта была створана з дапамогай сервера гугл карты, у якім першапачаткова быў створаны свой рэдактар, які і дазваляе ствараць інтэрактыўныя карты.

Вынікам нашай працы стала інтэрактыўная карта, з дапамогай якой кожны жадаючы можа здзейсніць віртуальнае падарожжа па малой радзіме. Дадзеная карта была размешчана на сайце ўстановы адукацыі ДУА “Валішченская сярэдняя школа” Пінскага раёна valische@roo-pinsk.gov.by, у раздзеле “Настаўніцкая”. Таксама пазнаёміцца з картай можна выкарыстаўшы дадзеную спасылку https://valisch1e.roopinsk.gov.by/%D1%83%D1%87%D0%B8%D1%82%D0%B5%D0%BB%D1%8C%D1%81%D0%BA%D0%B0%D1%8F/karta-pamiatnikov-pogibshim-v-gody-vov-na-territorii-valiscenskogo-selskogo-soveta, або QR-код.

Сучаснаму пакаленню, як і любому іншаму патрэбен ідэал. Прыклад дзейнасці гістарычных асоб ілюструе сапраўдны патрыятызм і грамадзянскую адказнасць за лёс краіны і

народа. Такім прыкладам з’яўляюцца жыхары нашай вёскі, якія загінулі у барацьбе за сваю Радзіму падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Месцы, дзе ўвекавечаны імёны тых, хто загінуў у барацьбе за сваю Радзіму падчас Вялікай Айчыннай вайны, ёсць амаль што ў кожным беларускім горадзе, пасёлку, вёсцы. На тэрыторыі Валішчанскага сельвыканкама – гэта помнік землякам у цэнтры аграгарадка Валішча, помнік-абеліск ахвярам фашызму ў в. Азарычы, безымянная магіла авіятара паміж дзвюма вёскамі Сакалоўка і Клятная, абеліск ахвярам фашызму ў в.Клятная.




Актывізавалася дзейнасць установы адукацыі па захаванні памяці аб генацыдзе беларускага народа, у першую чаргу навучэнцы больш падрабязна сталі знаёміцца з сямейнымі архівамі, праводзіліся экспедыцыі па малой радзіме з мэтай збору інфармацыі, праводзілася праца з архіўнымі дакументамі, якія былі прадстаўлены аддзелам ідэалагічнай работы Пінскага раённага выканаўчага камітэта.

Задача нас, маладога пакалення, аднавіць справядлівасць разам. Каб было менш безымянных магіл. Няхай сваякі загінуўшых байцоў ведаюць месца апошняга прыстанку сваіх блізкіх. Бо кожны салдат, які аддаў жыццё за Радзіму, варты павагі, шанавання і нашай памяці.

Работа гурткоўцаў па добраўпарадкаванню помнікаў, удзел у акцыях “Вахта памяці”, “Маршрутамі памяці. Маршрутамі адзінства”, “Я гэты край Радзімаю заву” дае магчымасць не толькі захаваць помнікі і абеліскі, але і пазнаёміць з імі ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыка-культурнай спадчынай Беларусі. Створаная інтэрактыўная карта помнікаў загінуўшым у гады Вялікай Айчаннай вайны, а таксама звесткі можна знайсці перайшоўшы па ссылцы https://www.google.com/maps/d/u/0/edit?mid=1s2qET_iBeMZ2EtHcBK0vxD-iQqdf25SU&usp=sharing або QR-код.

Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне - адна з самых значных падзей XX стагоддзя. І дзеля яе неабходна данесці да маладога пакалення і горач страт, і веліч народнага подзвігу. Гераічны летапіс Вялікай Айчыннай вайны - невычэрпная крыніца фарміравання ў вучняў патрыятычных пачуццяў. Дзякуючы сродкам і прыёмам выхавання ў яе выпрацоўваюцца крытэрыі ацэнкі ўчынкаў сваіх суайчыннікаў і сябе. Вопыт гісторыі дапамагае выпрацаваць маральную адзнаку навакольнай рэчаіснасці. На ўроках ствараецца творчая атмасфера. Вынік заўсёды станоўчы, калі выдзелены галоўныя і найбольш спрыяльныя выхаванню асобы факты [4].

Распрацаваныя інтэрактыўныя карты простыя ў выкарыстанні, даступныя і інфарматыўныя, што робіць іх выдатным наглядным дапаможнікам пры правядзенні ўрокаў, мерапрыемстваў, турыстычных маршрутаў па гісторыі вёскі Валішча і іншых вёсак на тэрыторыі Валішчанскага сельвыканкама. Карты эфектыўна дэманструюцца не толькі на звычайным экране ў спалучэнні камп’ютар-праектар, але і на інтэрактыўнай дошцы. Карты можна выкарыстоўваць на занятках краязнаўчага гуртка "Мой край і Я!", пры правядзенні ўрокаў гісторыі Беларусі ў раздзеле "Наш край", у час правядзення выхаваўчых мерапрыемстваў.

Урокі гісторыі закліканы дапамагчы школьнікам перажыць і асэнсаваць усё станоўчае, што было ў мінулым. Засваенне вучнямі ідэі любові да Радзімы дасягаецца, калі ідэі патрыятызму раскрываюцца перад розумам і сэрцам выхаванца ў яркіх, эмацыйных вобразах, абуджаюць у іх пачуцці суперажывання, падзякі да мужных змагароў за трыумф праўды, справядлівасці. Такім чынам, ажыццяўленне задач грамадзянскага выхавання патрабуе актыўнай грамадзянскай пазіцыі з боку настаўніка. Ідэі грамадзянскага і патрыятычнага выхавання асобы магчыма рэалізаваць не толькі дзякуючы мэтанакіраванай, свядомай дзейнасці настаўніка, але і актыўнаму ўдзелу дзяцей у вывучэнні беларускай гісторыі, гісторыі роднага краю, у пазнавальнай даследчай і творчай дзейнасці. Якасны ўзровень выхаванасці вучняў можа быць заўважны ў іх паводзінах, у адносінах да сябе, да навакольных, да праблем школы, горада, краіны, у іх актыўнай грамадзянскай пазіцыі [3].

Змест грамадзянска-патрыятычнага выхавання ва ўстанове адукацыі грунтуецца на метадах і метадычных прыёмах, якія садзейнічаюць фарміраванню прававой, палітычнай, працоўнай, прыродаахоўнай, эканамічнай і міратворчай культуры. Змест работы па фарміраванні ў вучняў грамадзянскай культуры ўключае выхаванне адказнасці за свой дом, развіццё нацыянальнай самасвядомасці, веданне сваіх правоў і абавязкаў, павагу да законаў краіны, гатоўнасць выконваць іх [4].

**Список использованных источников**

1. Агапова, И.В. Патриотическое воспитание в школе / И.В. Агапова, И.М. Давыдова. – М.: Айрис-пресс, 2002. – 174 с

2. Багдановіч, І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе: вучэб. дапам./ І.І. Багдановіч. – Мінск: БДПУ, 2009.

3. Буткевич, В. В. Патриотическое воспитание учащихся: история и современность / В.В. Буткевич. – Минск: Нац. ин-т образования, 2010. — 208 с.

4. Симоненко, О. Патриотическое и гражданское воспитание в рамках учебно-воспитательного процесса. Журнал «Гісторыя: праблемы выкладання» №2, 2006. С.22-25.